УДК 811.161.3’42:316.356.4(=161.3)

*А. С. Дзядова, В. А. Кукушкіна*

# БЕЛАРУСКІ МАСТАЦКІ ТЭКСТ ЯК НОСЬБІТ ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎЧАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ВЫРАЗНІК НАЦЫЯНАЛЬНАГА МЕНТАЛІТЭТУ

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны даследаванню агульных пытанняў нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускага мастацкага тэксту, а таксама разгляду моўных адзінак, якія рэпрэзентуюць лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў творах пісьменнікаў Віцебшчыны – Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна.
**Ключавыя словы**: лінгвакраіназнаўчая адзінка, мастацкі тэкст, менталітэт, нацыянальная карціна свету.

Змена навуковых парадыгмаў у сучаснай лінгвістыцы абумовіла лінгвакраіназнаўчы падыход да аналізу моўнага матэрыялу, у тым ліку і да мовы мастацкіх твораў, якія выступаюць адным са шляхоў спасціжэння сацыяльна-гістарычнай і этнакультурнай адметнасці народа.

Сёння лінгвістычныя даследаванні мастацкіх тэкстаў праводзяцца не толькі ў плане вывучэння моўна-стылістычных сродкаў, якія функцыянуюць у творах, але і, згодна з антрапацэнтрычным падыходам, з пункту гледжання таго, наколькі яны сваім зместам рэпрэзентуюць звесткі гістарычнага і нацыянальна-культурнага характару, асаблівасці рэлігійнага светапогляду і менталітэту таго ці іншага народа, даюць вытлумачэнне яго нацыянальнай карціны свету, сістэмы вербальных адзнак і сімвалаў, выяўляюць сацыяльныя адносіны ў грамадстве.

Даследаванне мастацкай творчасці пісьменнікаў з’яўляецца неабходнай умовай спасціжэння карціны свету пэўнай нацыі, у тым ліку яе этнакультурнага самаўсведамлення, бо, як адзначае прафесар В. А. Маслава, «галоўным захавальнікам духоўнага багацця народа з’яўляюцца мастацкія тэксты, моўная прастора якіх адлюстроўвае ўнутраны свет аўтара і асэнсаваны ў яго свядомасці свет знешні» [2, с. 126]. Выкарыстанне моўных элементаў з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў мастацкім дыскурсе пісьменніка ўяўляе цікавасць у першую чаргу для тых даследчыкаў, якія займаюцца праблемамі вывучэння мовы мастацкага тэксту як культурнага кода нацыі з пункту гледжання лінгвакультуралогіі і лінгвакраіназнаўства.

Нацыянальны мастацкі тэкст – гэта своеасаблівае люстэрка жыцця і працы, гаспадарчай дзейнасці, грамадскага і культурнага развіцця народа, адлюстраванне яго жыццёвага вопыту, светаўспрымання, асаблівасцей мыслення і псіхікі, маральна-этычных і эстэтычных нормаў, а таксама тых ці іншых краіназнаўчых рэалій. У творах сапраўды нацыянальнага пісьменніка заўсёды

знаходзіць сваё выяўленне свет нацыянальнага быцця. Адлюстраванне ў літаратуры нацыянальнага менталітэту надае ёй самабытнасць, арыгінальнасць, нацыянальную адметнасць і робіць сапраўднай выразніцай духоўнай існасці народа. Тыя ці іншыя асаблівасці менталітэту этнасу, навакольнага асяроддзя, у якім ён знаходзіцца, выяўляюцца ў характары жыццёвага матэрыялу, што адбіраецца пісьменнікамі.

Для большасці беларускіх аўтараў тэма роднага краю, сваёй Бацькаўшчыны з'яўляецца адной з вызначальных у творчасці. Пачынаючы з Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сімяона Полацкага сімвал роднай зямлі скразны ў беларускай літаратуры. Па словах В. Каваленкі, «уяўленне пра родную зямлю – гэта важны духоўны набытак народа. І ўзнікае яно не адразу. Патрэбна не толькі гаспадарчая, але і ўнутраная абжытасць мясцовасці, каб яна выклікала эмоцыі замілавання» [1, с. 22]. Прыродны свет, навакольнае асяроддзе, ва ўлонні якога народ сцвярджае сваё гістарычнае быццё, аказваюць значнае ўздзеянне на фарміраванне этнічнага характару. Заўважым, што стварэнне ў беларускай літаратуры асаблівасцей нацыянальнага светапогляду належыць пісьменнікам-класікам – Янку Купалу, Якубу Коласу, Максіму Гарэцкаму, Кузьму Чорнаму. Быццёвы, матэрыяльны пачатак выражаны ў адлюстраванні гэтымі мастакамі слова найперш рэчыўнага, побытавага свету, будзённых рэалій жыцця, паэтызацыі беларускай прыроды, самабытнай культуры і спосабу мыслення нашага народа.

Беларусь спрадвеку лічылася краінай сялянскай культуры, што і прадвызначыла своеасаблівы лад традыцыйнай народнай культуры і ментальнасці беларускай нацыі. Для беларуса імкненне мець уласную зямлю – гэта жаданне прывесці жыццё ў адпаведнасць з яго сутнасцю. Страту зямлі героі твораў вельмі часта ўспрымаюць як парушэнне гармоніі, страту жыццёвай асновы, грунту пад нагамі. Такія матывы адчуваліся яшчэ ў паэзіі аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры XIX ст. Францішка Багушэвіча (вершы «Мая хата», «Ахвяра»), а пасля ў творчасці Максіма Багдановіча (верш «Слуцкія ткачыхі»), драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» і інш.

Культ зямлі, апяванне чалавека на зямлі, зямлі як асновы ўсяго існага з'яўляецца асноўнай, вызначальнай тэмай шматлікіх твораў беларускай літаратуры («Новая зямля» Якуба Коласа, «Зямля» Кузьмы Чорнага, «Палеская хроніка» Івана Мележа, творы Вячаслава Адамчыка, Івана Пташнікава і інш.). Трэба адзначыць, што стварэннем нацыянальнай ідэі беларускага народа наша літаратура абавязана Уладзіміру Караткевічу, творчасць якога прасякнута мноствам культурных кодаў беларускага этнасу, змяшчае ў сабе інфармацыю пра яго гісторыю, этнаграфічныя адметнасці, нацыянальныя паводзіны і псіхалогію – усё, што складае змест этнічнай культуры беларусаў.

Заўважым, што да сённяшняга часу ў беларускім мовазнаўстве адсутнічаюць сур'ёзныя навуковыя напрацоўкі па пытаннях даследавання мовы мастацкіх твораў у этналінгвістычным і лінгвакраіназнаўчым аспектах. Больш

за тое, у айчыннай лінгвістыцы недастаткова распрацаваным і асэнсаваным застаецца нацыянальна-культурны і сімвалічны аспект функцыянавання беларускай мовы ў рэгіянальным соцыуме. Між тым вывучэнне мовы рэгіянальных мастацкіх тэкстаў неабходнае сёння з пазіцый развіцця рэгіянальнай лінгвістыкі ў процівагу працэсам глабалізацыі, якія актыўна адбываюцца ў сучасным свеце. З гэтай прычыны актуальнасць тэматыкі нашага даследавання абумоўлена якраз неабходнасцю вывучэння моўных адметнасцей Віцебскага рэгіёна, у тым ліку вывучэння лінгвакраіназнаўчай спецыфікі мастацкіх твораў, якія выступаюць як адзін са складнікаў разумення гістарычнага мінулага, этнічнай культуры і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа ў цэлым і спосаб рэпрэзентацыі нацыянальнай карціны свету жыхароў Віцебшчыны ў прыватнасці.

Матэрыялам для нашага даследавання паслужылі мастацкія творы Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, дзе праз сістэму моўных сродкаў даволі поўна і глыбока адлюстраваны этнакультурныя здабыткі і маральныя арыенціры беларусаў, іх традыцыйнае народнае мысленне. Аб’ектам увагі з’яўляюцца лінгвакраіназнаўчыя адзінкі, якія семантызуюць беларускую гісторыю і культуру як цэласныя моўныя знакі. Гэта перш за ўсё датычыць лексічнага матэрыялу з «нацыянальным фонам» – назваў рэалій і паняццяў са сферы матэрыяльнай і духоўнай культуры нашага народа, жывёльнага і расліннага свету Беларусі, прэцэдэнтных імёнаў і геаграфічных назваў, у змесце якіх рэпрэзентаваны спецыфічныя рысы менталітэту і светаўспрымання беларусаў, іх сацыяльных паводзін.

Лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў даследаваных мастацкіх тэкстах пісьменнікаў Віцебшчыны нясуць разнастайныя па сваім змесце моўныя адзінкі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння – словы і спалучэнні слоў, народныя параўнанні, фразеалагізмы, афарыстычныя выслоўі, якія рэпрэзентуюць тыя ці іншыя гістарычныя рэаліі беларускага народа, асаблівасці тэрыторыі і месца яго пражывання, культурнай і гаспадарчай дзейнасці. Так, да нацыянальна-маркіраваных моўных адзінак, якія семантызуюць лінгвакраіназнаўчую інфармацыю ў моўных кантэкстах твораў названых вышэй аўтараў, адносяцца наступныя:

1) лексіка са сферы матэрыяльнай культуры, словы-этнаграфізмы (*асвер*, *бульба ў панчошках*, *бульбянішча*, *варыўня*, *ватоўка*, *грубка*, *жалейка*, *кубелка*, *клямка*, *крупнік*, *намітка*, *падстрэшша*, *пасталы́*, *пачынак*, *рэзгіны*, *цабэрак*, *цярновачка*, *шапка-кучомка*);

2) лексіка са сферы духоўнай культуры (*Вадзянік*, *Вадохрышча*, *Велес*, *вяснянка*, *Грамніцы*, *Дамавік*, *заручыны*, *Змітраўскія дзяды*, *Каложская царква*, *Каляды*, *Купалле*, *Куцця*, *манастыр Барыса і Глеба*, *Масленіца*, *папараць-кветка*, *Русальны тыдзень*, *Сафійка*, *Сёмуха*, *Русальны тыдзень*, *Янава ноч*);

3) найменні гістарычнага характару, назвы грамадска-палітычных і гаспадарчых рэалій (*Грунвальд*, *калгас*, *капа́*, *Котлас*, *Курапаты*, *маршалак*, *паншчына*, *талака*, *шлях «з вараг ў грэкі»*);

4) назвы прыродных з'яў і аб'ектаў (*багна*, *балота*, *бусел*, *баравінка*, *валун*, *вербалоз*, *грыбасей*, *жыта*, *знічка*, *зубр*, *імшарнік*, *маладзік*, *рунь*, *тарфянішча*, *твань*);

5) антрапонімы (*Багдановіч*, *Барбара Радзівіл*, *Браніслаў Тарашкевіч*, *Еўфрасіння Полацкая*, *Колас*, *Купала*, *Куляшоў*, *Марк Шагал*, *Мележ*, *Скарына*, *Язэп Драздовіч*);

6) тапонімы (*Беразяны*, *Вушача*, *Верасовачка*, *Віцебск*, *Гародня*, *Гліняны*, *Дзвіна*, *Залоззе*, *Лісічанская пушча*, *Лясіны*, *Мінск*, *Нёман*, *Слуцк*, *Ушаччына*, *Чарнобыль*);

7) этнічныя, у тым ліку лінгвістычныя, паняцці, тэрміны і номены (*балцкая кроў*, *беларуская мова*, *беларусы*, *кірыліца*, *мова-крывічанка*, *радаводнае дрэва*, *родная мова*);

8) розныя другасныя онімы («*Купалінка*», «*Лябедзік*», «*Ветрык*», «*Перапёлачка*», «*Лявоніха*», «*Хроніка Быхаўца*»);

9) устойлівыя моўныя выразы і народныя афарызмы (*вянок з гароху надзець*; *неба з аўчынку*; *кукіш у кішэні*; *грыбоў – хоць закладай касу*; *першая чарачка – як сінічка*, *другая – як жаваранaчка*; *хварэць на пана*; *які клапот, такі і ўмалот*);

10) вобразна-выяўленчыя сродкі мовы з нацыянальна-культурнай канатацыяй:

– словы-сімвалы (*бусел*, *валошка*, *васілёк*, *крумкач*, *лён*);

– эпітэты (*Беларусь завадская*, *зубрыная*; *васільковы спакой*; *вочкі-зорачкі*; *гаі белакорыя*; *гасцінны край*; *даланя кляновая*; *жарэбная чарнобыльская хмара*; *жаўрукова мова*; *жытняе слова*; *край ласкава-лясны*; *планета бульбападобная*; *край сінявокі*; *купальскія вянкі*; *лес-беларус*; *песня-крынічанька*);

– метафары (*веснаплынных вятроў талака*; *воз жыцця*; *вочы хат*; *даланя за́сланкі*; *загон дзён*; *ланцуг туману*; *інваліды – асколкі вайны*; *загінае палец серп*; *пасвіцца прыцемак*; *слова крывічоў*; *смяецца печ – апора хаты*);

– метанімічныя выразы (*бяліла лён на світку Каліноўскаму*);

– параўнанні (*азёры*, *як неба сінія*; *зямля сухая*, *як далонь земляроба*; *госць у хаце – Бог у хаце*; *як яблык*, *крамянае і хрупаткое слова* «*Беларусь*»);

– іншыя сродкі мастацкай выразнасці (*гаварыць – серабро*, *маўчаць – золата*; *зямля пад белымі крыламі*; *лён – апошні сінявокі беларус*; *ільновалосыя Селянінавічы*).

Гэтыя і іншыя лінгвакраіназнаўчыя адзінкі ў мастацкай тканіне даследаваных тэкстаў рэпрэзентуюць не толькі тыя ці іншыя краіназнаўчыя рэаліі, але і ўнікальнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцыйныя маральныя каштоўнасці, этнічны характар, мудрасць і таленавітасць беларусаў як самастойнай нацыі, якая фарміравалася і развівалася ў пэўным сацыяльна-культурным асяроддзі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Каваленка, В. А.** Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 225 с.

2. **Маслова, В. А.** Современные направления в лингвистике: учебное пособие / В. А. Маслова. – Москва: Академия, 2008. – 264 с.

УДК 811.161.3’367.4:398.8(=163.3)

***В. Э. Зіманскі***

## ЭКСПРЭСІЎНЫЯ ФОРМЫ ПРОСТЫХ ЗВАРОТКАЎ У МОВЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ

**Анатацыя.** Паэтычны зваротак як асаблівы зварот да пэўнага аб’екта ў фалькорнай абрадавай паэзіі мае больш шырокае прызначэнне, чым у паўсядзённых зносінах ці ў паэтычных творах: яго ўжыванне неабавязкова падразумявае наступны дыялог і ў той жа час выконвае яркую экспрэсіўную функцыю. Дадзенае даследаванне мае на мэце вызначэнне асаблівасцей функцыянавання экспрэсіўных форм простых звароткаў для надання выразнасці творам абрадавай паэзіі. Вызначана, што ў эмацыянальна-экспрэсіўнай форме звароткі ўжываюцца часцей, чым у нейтральнай; гэта тлумачыцца спецыфікай фальклорных песенных твораў: акрамя выканання вакатыўнай функцыі, яны перадаюць просьбу, пытанне і адказ на яго, скаргу, зварот па параду, падзяку, параду, павучанне, ужываюцца з мэтай выклікаць эмоцыі і пачуцці – жаласць, тугу, радасць, любоў, ласку, замілаванне і пад. Зваротак у памяншальна-ласкальнай форме можа быць адрасаваны не толькі людзям, але і іншым жывым і нежывым істотам (святу і яго ўдзельнікам, прыродным стыхіям, жывёлам, птушкам, раслінам, міфічным істотам) і здольны не толькі характарызаваць адносіны да адрасата, але і выконваць некаторыя магічныя функцыі: задобрыць, паспагадаць, суцешыць, выказаць прыхільныя адносіны, выклікаць давер і атрымаць у выніку адпаведную рэакцыю субяседніка (апелятыўная функцыя). Акрамя таго, зваротак уплывае на кампазіцыю твора, стварае непаўторныя матывы з пункту гледжання нацыянальных асаблівасцей. Матэрыял даследавання можа быць карысны ўсім, хто цікавіцца беларускай народна-песеннай творчасцю, беларускім словам, дбае пра павышэнне свайго моўнага і культурнага ўзроўню.
**Ключавыя словы**: зваротак, паэтычны зварот, экспрэсіўнасць, народная вусна-паэтычная творчасць, абрадавая паэзія, сродак выражэння.

У паўсядзённым жыцці нам неаднаразова даводзіцца звяртацца да людзей, жывёл і нават рэчаў, якія нас акружаюць. У большасці выпадкаў для таго, каб звярнуць на сябе ўвагу іншай асобы, мы выкарыстоўваем у сваёй мове звароткі – словы або спалучэнні слоў, што называюць асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай, заклікам, просьбай, якім наогул адрасавана выказванне, выражанае ўсім сказам. Ад зваротаў, якія чалавек адрасуе субяседніку, уступаючы ў размову, адрозніваюць паэтычныя звароты [3, 61] – паэтычны прыём звароту да рэчаў і з’яў; яго адрозненне ад звароткa ў тым, што паэтычны зварот не прадугледжвае наступны дыялог, паколькі адсутнічае рэальны